


Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Пейджинговую связь "ГС" обеспечивает НП ООО "Защита-Сервис". ТЕЛЕФОН В Г.ГРОДНО (8-22)-75-00-66, В Г.СЛОНИМЕ 2-64-44

Газета Слонімская

№47 (233). 22 —28 лістапада 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 200 руб.

ЦІ БУДЗЕ СЛОНІМ АДНОЎЛЕНЫ?



Фота Віталя ГЛЯ

У наступным годзе Слонім адзначае 750-годдзе свайго утварэння. З гэтай нагоды ўлады запланавалі шэраг мерапрыемстваў па аднаўленню горада. У тым ліку і здачу ў эксплуатацыю моста, што на Савецкай вуліцы.

(Працяг на 2 стар.)

САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТ З МАСТОЎ ЯЗЭП ПАЛУБЯТКА АШТРАФАВАНЫ НА 1.162.500 РУБЛЁЎ.



ЧЫТАЙЦЕ НА 2 СТАР.

РЕДАКТОРА ГАЗЕТЫ "ПАГОНЯ" В ОЧЕРЕДНОЙ РАЗ БУДУТ СУДИТЬ.



ЧИТАЙТЕ НА 4 СТР.

ТРЕНЕР "КОММУНАЛЬНИКА" ЛЕОНИД САВИЦКИЙ ВЫСТАВЛЯЕТ ВЕТЕРАНОВ КОМАНДЫ НА ТОРГИ.



ЧИТАЙТЕ НА 15 СТР.

Афіша


КІНАТЭАТР "МІР"

22 лістапада
- "Няма чаго губляць" — камедыя.
Сеансы: 15, 17, 19, 21.

23 лістапада
- "Цюрага" — баявік
Сеансы: 17, 19, 21.

24 лістапада
- "Толькі для дрэнных хлопцаў" — відэа (баявік).
Сеансы: 15, 17, 19, 21.

25 лістапада
- "Тубулентнасць – 3" — відэа (баявік).
Сеансы: 15, 17, 19, 21.



ДРАМТЭАТР

25 лістапада
- "Дзень нараджэння" — для дзяцей.
Пачатак у 12 гадзін.
- "Чужыя грошы" — для дарослых.
Пачатак у 18 гадзін.

Ідзе падпіска на "Газету Слонімскую" на 1-ае паўгоддзе **2002** года

КОШТ ПАДПІСКІ на адзін месяц: індывідуальны (індэкс 64042) **1264** руб. ільготны (індэкс 63646) **1051** руб. ведамасны (індэкс 63818) **2191** руб.

На "Газету Слонімскую" можа падпісацца **ЛЮБЫ ЖЫХАР БЕЛАРУСІ.**

РЭПЛІКА

"ЗАХОЎВАЙЦЕ ГРОШЫ Ў БАНКУ!"

Гэты вядомы лозунг савецкіх часоў, які змяшчаўся ў ашчадных касах, і цяпер не састарэў. Бо і зараз з усіх тэлеканалаў розныя банкі пад розныя працэнты заклікаюць людзей даверыць ім свой капітал.

А рэальна цяперашняя банкаўская сістэма Беларусі (як частка сістэмы дзяржаўнай) абыходзіцца з укладчыкамі прыкладна так, як гэта здарылася са слонімскім пенсіянерам Васілём Карпінскім.

У 1991 годзе Васіль Тадэвушавіч паклаў у Слонімскае аддзяленне ашчаднага банка СССР на тэрмін звыш пяці гадоў дзве тысячы савецкіх рублёў.

Праз год пачалася навейшая гісторыя Беларусі, і маладая самастойная дзяржава ўзяла ўсе абавязкі перад укладчыкамі на сябе. Не будзем зараз пералічваць прыбытак Васіля Карпінскага на працэнты па гадах, але да 1994 года сума (намінальна) павялічвалася.

Пасля першай дэнамінацыі рэзка зменшылася, і з кожным наступным годам грошы гублялі сваю пакупную вартасць. А сёння з колішніх 2 тысяч савецкіх рублёў на рахунку слонімскага аддзялення "Беларусбанка" у пенсіянера Карпінскага застаецца... 135 беларускіх рублёў. На іх нават два квіткі на гарадскі аўтобус не купіш.

Такія вось атрымаліся "працэнты" за дзесяць гадоў трымання капіталу ў банку.

Мікола КАНАНОВІЧ

Курсы обмена валют в г.Слониме по состоянию на 20 ноября 2001г.

"Приорбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1525	1570
1 DM	660	700
1 RUR	51	53
"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1540	1555
1 DM	670	700
1 RUR	51	53
ОАО "Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1530	1565
1 DM	660	700
1 RUR	51	53
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1520	1545
1 DM	660	700
1 RUR	50	52
Нацбанк РБ		
1 EURO	1342.31	


Цены на слонимском рынке по состоянию на 20 ноября 2001г

Продукт	Цена за кг
Гранаты	1200 — 2500
Бананы	1000
Апельсины	1400
Яблоки	200 — 800
Киви	250 — 350 (шт.)
Помидоры	1300 — 1500
Капуста	150 — 300
Морковь	400 — 500
Лук	600
Чеснок	1500
Картофель	150 — 200
Молоко	250
Творог	800
Масло	3000
Яйца	1500
Свинина	3800 — 4000
Говядина	3800 — 4000
Баранина	4000
Сало	3200 —3400
Телятина	3800 — 4000
Мед	5500 — 6000
Сметана	1200
Лимоны	1400
Мандарины	1700

наш горад

ЦІ БУДЗЕ СЛОНІМ АДНОЎЛЕНЫ?

У 2002 годзе сланімчане адзначаць 750- ю гадавіну ўтварэння г. Слоніма, які упершыню быў узгаданы ў Іпацьеўскім летапісе ў 1252 годзе.



Будучы Дом правасуддзя



Будынак вакзала



Тут павінна быць пляцоўка пад летнюю эстраду

Яшчэ дзевяць месяцаў назад, у лютым бягучага года, галоўны архітэктар нашага горада Уладзімір Казырновіч паведаміў у інфармацыйным бюлетэні гарадскога Савета дэпутатаў і гарвыканкама "Слонимские ведомости" ("СВ") пра тое, што "робіцца па рэканструкцыі і абнаўленню напярэдадні юбілею".

Так, па словах Уладзіміра Іванавіча, да 2002 года ў Слоніме будзе зроблена наступнае:

1. Будынак ЗАГСа будзе перанесены з цэнтральнай плошчы на Брэсцкую вуліцу, дзе стаіць недабудаваны ўніверсам, які перададзены ўпраўленню юстыцыі пад суд і юрыдычную кансультацыю.
2. На тэрыторыі за Домам культуры з'явіцца пляцоўка пад летнюю эстраду са стаянкай і інш.
3. Часткова будзе рэканструявана набярэжная канала Агінскага.
4. У скверы на вул. Пушкіна пройдзе капітальны рамонт.
5. На міні-рынку на вул. Школьнай з'явяцца новыя павільёны.
6. Добраўпарадкуецца тэрыторыя ля магазіна "Лета".
7. Будзе адрамантаваны фасад і пасадачныя пляцоўкі слонімскага вакзала.
8. Зменіцца аблічча магазінаў у цэнтры горада.

Шмат яшчэ іншых задумак. Але, на жаль, яны так і застаюцца пакуль планамі. Напрыклад, у скверы на плошчы Леніна мог з'явіцца помнік Льву Сапегу, але перамовы наконт гэтага з фондам Сапегі не далі пэўных вынікаў. Не завершана добраўпарадкаванне гарадскога парку. Да гэтага часу таксама невядомы лёс будынка пад драмтэатр. У горада на яго будаўніцтва няма сродкаў.

Да святкавання 750-й гадавіны Слоніма плануецца прывесці ў належны выгляд вуліцы Савецкая, Школьная, Чырвонаармейская, Шасэйная і інш., адрамантаваць капітальна гасцініцу. Але ці будзе ўсё гэта зроблена да юбілею?

Пакуль што, патроху рамантуецца гарадская прыбіральня і праводзяцца работы па добраўпарадкаванню гарадскога стадыёна, нібы пакрысе ідзе да завяршэння будаўніцтва мастоў па вул. Савецкай.

Але ці будзе ўвогуле нешта зроблена ў наступным годзе, — невядома. Бо, як паведаміў Уладзімір Казырновіч яшчэ ў пачатку года ў артыкуле "СВ", "для таго, каб і цэнтр, і гарадскія ўскраіны змяніліся ў лепшы бок, неабходна дастатковае фінансаванне ўсіх работ". А юбілей не за гарамі. У сувязі з гэтым узнікае пытанне: ці з'явяцца грошы на аднаўленне Слоніма?

Вольга ШЫНКЕВІЧ

АВАРЫЙНАЯ СЛУЖБА ГАРГАЗУ ПРАЦУЕ БЯСПЛАТНА

Пытанне аб аплаце за выклік міліцыі, хуткай медыцынскай дапамогі, пажарных ці аварыйнай службы гаргазу асабліва ў мяне не паўставала ніколі, бо працуюць яны для грамадзян бясплатна.

Тым не менш, у рэдакцыю "ГС" патэлефанавала жыхарка Слоніма і паведаміла, што калі яна адчула пах газу ў сваім доме, то паспрабавала выклікаць аварыйную гаргазу, але там ёй у выездзе на месца адмовілі. Сказалі, што такія паслугі выконваюцца толькі пасля перадаплаты. У сувязі з гэтым карэспандэнт "ГС" звярнуўся да дырэктара "Слоніммежрайгазу" Анатоля Рудакова, каб даведацца — можа сапраўды прадпрыемства ўвяло новы від паслуг.

— Гэта глупства. Выязджаем мы па кожнаму званку, — паведаміў Анатоль Аляксандравіч. — Мы зацікаўлены тым, каб стварыць бяспеку эксплуатацыі газавых сетак.

У слонімскага гаргазу на месяц прадугледжаны ліміт на аварыйныя выезды — 5000 кіламетраў. У сярэднім жа за месяц прыходзіцца наездзіць прыкладна 4000 кіламетраў. Ніякая аплата за выезд не прадугледжана, і калі, па словах Анатоля Рудакова, нехта вырашыў браць хабар, то па такіх фактах мы разбярэмся і пакараем вінаватага.

Валерый КАВАЛЕНКА

Крымінал

ПАГАНДЛЯВАЛІ МЯСАМ...

Жыхар горада Мінска грамадзянін Макляцаў вырашыў крыху падзарабіць без рэгістрацыі прадпрымальніцкай дзейнасці.

Ён наладзіў абмен буйной рагатай жывёлы ў калгасах Магілёўскай вобласці на дызельнае паліва. Жывёлу ён потым здаваў на пераапрацоўку на слонімскі мясакамбінат, выкарыстоўваючы рэквізіты фірмы "Лоргус". Такім чынам, сума атрыманага прыбытку ад такой дзейнасці склала больш за 8,5 мільёны рублёў. А вынік — мяса (6 904 кг) пайшло ў даход дзяржавы. Грошы таксама. А грамадзянін Макляцаў асуджаны да штрафу ў памеры 600 мінімальных зарплат (4,5 мільёны рублёў).

...І МЭБЛЯЙ

Не менш "удала" пагандляваў і жыхар Слоніма В.Ч. Толькі пагарэў ён на незаконным гандлі мэбляй.

За ажыццяўленнем чарговай здзелкі ён і быў схоплены за руку. Падчас расследавання выявілася, што на гандлі мэбляй В.Ч. зарабіў 2 мільёны рублёў. Суд Слоніма і Слонімскага раёна прысудзіў "гандляра" да ўмоўнага тэрміну пакарання, але ж незаконна зробленыя грошы прыйшлося аддаць дзяржаве. Да таго ж, і 480 даляраў ЗША, якія былі канфіскаваны пры затрыманні грамадзяніна В.Ч., таксама засталіся за дзяржавай.

Валерый КАВАЛЕНКА

МАСТЫ

АБАРОНА РАБОЧЫХ КАШТАВАЛА 155 МІНІМАЛАК

З трэцяга разу ў Мастах адбыўся суд над Язэпам Палубяткам, які разам з іншымі падаваў заяўку на правядзенне мітынгу ў абарону рабочых.

Напачатку аргкамітэт па правядзенню мітынгу падаў заяўку правесці яго 2 кастрычніка. Улады папрасілі арганізатараў перанесці мерапрыемства на іншы тэрмін у сувязі з днём Памяці. У наступнай заяўцы, адрасаванай у райвыканкам, была назначана дата 10 лістапада ў 12 гадзін. Аднак улады далі згоду правесці акцыю 11 лістапада ў 9.00 і пра гэта паведамілі толькі аднаму з арганізатараў — Палубятку — 9 лістапада, тым самым парушылі Закон. Бо адказ павінен быць дадзены за 5 дзён да дня правядзення мерапрыемства. Людзям пра перанос мітынгу загадзя паведамлена не было, і яны сабраліся 10 лістапада. Напачатку па гэтай справе двое суддзяў узялі самаадвод. Таму справу разглядала старшыня раённага суда Галіна Грудская. Яна беспадстаўна пазбавіла ўдзелу ў судовым працэсе прадстаўніка Беларускага Хельсінскага камітэта Аляксандра Антанюка, не звярнула ніякай увагі на дзеянні райвыканкама. Спадарыня Грудская прызнала арганізатарам мітынгу Язэпа Палубятку і прысудзіла яму ў якасці пакарання штраф 155 мінімалак, а гэта 1 162 500 рублёў.

Леў БАРТАШ

"СВАБОДНЫ ПРАФСАЮЗ" ЗАСТАЎСЯ БЕЗ ЛІДЭРА

Праз два дні пасля правядзення мітынгу ў абарону працоўных быў зволены рабочы сумеснага беларуска-германскага прадпрыемства "Самана-плюс", лідэр "Свабоднага прафсаюза" Валерый Ярэменчук.

Ён быў прызнаны прафесійна-непрыгодным з-за траўмы, якую атрымаў на вытворчасці. Такое рашэнне прыняў кіраўнік прадпрыемства Аляксандр Шумік. Наколькі яно было правільнае, цяпер вызначыць суд.

ПАСТРАЛЯЎ І СХАВАЎСЯ

А першай гадзіне ночы на адной з цэнтральных вуліц Мастоў пачуліся ружэйныя стрэлы.

Як аказалася, гэта раней судзімы мясцовы жыхар вырашыў такім чынам выклікаць з дому сваю знаёмую і адкрыў страляніну па воknах яе кватэры з паляўнічай стрэльбы. Пасля трох стрэлаў мужчына кінуўся наўцёкі. Міліцыя займаецца яго пошукам.

ЗАБІЎ ЖОНКУ, А ПАСЛЯ – СЯБЕ

На мінулым тыдні ў Мастах здарылася жудасная трагедыя.

47-гадовы жыхар з вуліцы Будаўнікоў падчас сямейнай спрэчкі забіў жонку, а потым павесіўся сам.

Іх трупы міліцыя выявіла на наступны дзень, пасля таго, як у аддзел патэлефанавалі суседзі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ПА ВОБЛАСЦІ

206 ЗЛАЧЫНСТВАЎ ЗА ТЫДЗЕНЬ

Па дадзеных Гродзенскага абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў, з 8 па 14 лістапада па вобласці было зарэгістравана 206 злачынстваў і здарэнняў.

Гэта — 2 забойствы, 8 цялесных пашкоджанняў, 4 разбоі, 8 махлярстваў, 7 хуліганстваў, 62 крадзяжы дзяржаўнай і асабістай маёмасці. Зафіксавана таксама было 8 фактаў з'яўлення фальшывых купюр, 8 выпадкаў канфіскацыі наркатычных сродкаў, 21 дарожна-транспартнае здарэнне, у выніку якіх загінула два чалавекі. За тыдзень загінула 17 і паранена 23 чалавекі.

Валерый КАВАЛЕНКА

СЛОНІМ

МЯСА ПРАДАЛІ БОЛЬШ, А ЖЫВЁЛЫ ВЫГАДАВАЛІ МЕНШ

Па дадзеных Слонімскага раённага аддзела статыстыкі за тры кварталы бягучага года ў сельскай гаспадарцы раёна рэалізавана на забой жывёлы і птушкі 5 585 тон, што на 13% больш, чым за такі ж перыяд мінулага года.

У той жа час, на 1 кастрычніка 2001 года колькасць буйной рагатай жывёлы скарацілася на 4% і склала 36 244 галавы, што менш на 180 галоў у параўнанні з мінулым годам за адпаведны перыяд.

Атрымліваецца, што павелічэнне рэалізацыі мяса ідзе ў значнай меры за кошт зніжэння пагалоўя статка ў гаспадарках раёна.

Валерый КАВАЛЕНКА

В ДУХОВНОЙ АКАДЕМИИ ДУХОВНОЕ ОБЩЕНИЕ

В Жировичах прошел республиканский студенческий семинар ВУЗов Беларуси, посвященный жизни и творчеству Федора Достоевского и приуроченный 180-летию со дня рождения великого писателя.

Организатором мероприятия выступила Минская Духовная Академия совместно с редакцией православного студенческого журнала "Ступени". В семинаре участвовало более 30 студентов из Минска, Могилева, Гомеля, Гродно, Бреста, Полоцка, Мозыря. Молодых людей объединил интерес к творчеству великого писателя. Семинар дал хорошую возможность для дружеского общения его участников. Итоговый документ, принятый на семинаре, засвидетельствовал решение участников и организаторов сделать традиционным проведение подобных межвузовских семинаров на базе Минской Духовной Академии.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЛИДА

МАССОВЫЕ СОКРАЩЕНИЯ НА ОБУВНОЙ ФАБРИКЕ

Массовые сокращения ожидаются на Лидской обувной фабрике.

По словам ее директора Казимира Лунца, необходимо сократить около 300 человек. Ежемесячно 6-8 миллионов рублей предприятие платит рабочим за простой. В этом году коллектив фабрики сократился уже на 118 человек.

В прошлом году лидские производители обуви организовали забастовку возле здания горисполкома, протестуя против массового сокращения, — сообщает **www.praca.by**. Ничего, однако, к лучшему не изменилось.

ЗЭЛЬВА

ГАЗЕТА ЗАЙМЕЛА РАЁННЫ СТАТУС

Газета "Зэльвяначка", што выходзіць у Зэльве і распаўсюджваецца сярод настаўнікаў горада, займела раённы статус.

Зараз гэтае выданне будзе распаўсюджвацца па школах Зэльвенскага раёна.

Аўтарамі выдання з'яўляюцца настаўнікі, вучні і бацькі.

СЯБРОЎСКІ ЧАСОПІС ДЛЯ МАСТАКОЎ

На старонках часопіса перапклады Алены Таболіч, творчасць Валерыя Жамойціна, рэпрадукцыі зэльвенскага мастака Васіля Шамрука.

Асобнае месца ў часопісе адведзена асвятленню апошніх падзей, якія адбываліся на Зэльвеншчыне ў 2001-м годзе.

Заснавальнік і адзін з гаспадароў гэтага выдання Юрый Качук.

Андрэй Мялешка

СЛАДКАЯ ВЫСТАВКА

Во вторник, 20 ноября, в здании слонимского исполкома прошла выставка ОАО "Світанак" под названием "Новый год 2002 – детям".

Всем приглашенным было предложено посмотреть на широкий ассортимент конфет российских и белорусских кондитерских фабрик.

Директор фирмы "Світанак" Василий Духовник посоветовал присутствующим, что к комплектации новогодних подарков для детишек следует готовиться уже сейчас. Всем желающим фирма "Світанак" может помочь подготовить сладкие наборы согласно их заказу.

Ольга ШИНКЕВИЧ


Фота Віталя ГІЛЯ

Фельетон

КУРЫНАЯ СЛЕПАТА


Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Усё ведае разумніца статыстыка, а вось за адно пытанне яшчэ і не бралася. Не можа сказаць, колькі існуе прычын для сварак у суседзяў, тым больш, у суседзяў-вяскоўцаў. А іх вялікае мноства. Галіна яблыні перавесілася праз плот і бессаромна скідвае плады на суседскі надворак. З апетытным хрустам іх есць чужая хаўронья. Хіба не крыўдна? Яшчэ і як: сваё дабро задарма прападае.

Зноў жа з суседавай страхі вада капае проста на наш участак. Што ні дождж – то ланцужок кропляў. А колькі за лета пройдзе дажджоў? Шкоды вялікай няма, але ж крыўдна: нашто нам чужы капеж?

І яшчэ. Суседка па ваду з вёдрамі пойдзе, а чужы муж затрымае на ёй погляд крыху даўжэй, чым дазволена па сямейнаму статуту. І нараз дачкай заскрабе злосць на сэрцы ў законнай жонкі. Справядліва: на яе муж так не глядзеў ні разу за апошнюю пяцігодку.

А куры? Гэта ж проста яблык разладу для няўжыўчывых суседзяў. Неразумныя птахі не разбіраюць, дзе свае грады, а дзе чужыя. Грабуць без разбору. Такую крыўду цяжка сцярпець. І Іван Іванавіч Шабунька з вёскі Забэцкі не церпіць. Аднойчы ён убачыў на сваім агародзе адбітак дзвюх чужых курыных лапак і ажно з твару змяніўся:

– Зноў яе, Казіны, пярнатыя грады топчуць! – сагнуўшыся, наколькі дазваляла старая спрацаваная спіна, разглядваў галінкі курыных слядоў абражаны сусед. – Не можа быць, каб я памыліўся. У нашых курэй шпоры карацейшыя, а гэта нейкія доўгія, з загагулінамі. Ды лепш па курынай картатэцы зверу.

Іван Іванавіч дастаў з патаемнага месца картатэку з адбіткамі курыных лапак, і да вечара ісціна была ўстаноўлена: па агародзе тапталася суседская чубатка. У картатэцы ні адзін адбітак не адпавядаў таму, што быў знойдзены на цыбульнай градзе.

Так у вёсцы Забэцкі пачаўся скандал. А можа і не так. Цяпер, за даўнасцю часу (варожасць цягнецца гадамі) ні Іван Шабунька са сваёй жонкай Лёдзяй, ні Казя Цюпік са сваім мужам Сымонам дакладна сказаць не могуць, з-за чаго імена ў іх пачалася калатнеча. Але адступаць і мірыцца ніхто не хоча.

За гэтым скандалам пайшоў другі: у Івана і Лёдзі прапаў баран. Прапаў і прапаў – як у ваду кануў. Страслі ваколіцу – ні рожак, ні ножак не знайшлі. І тады падазрэнне ўпала на суседзяў: яны прыманілі і зарэзалі. Варожасць умацавалася яшчэ больш. Да таго дайшло, што ў адзін звычайны дзень суседзі пайшлі ўрукапашную. Ды так спадабаўся ім гэты метад высвятлення адносін, што карыстаюцца ім пастаянна. Ужо так павялося: у адной сям'і здарыцца якая-небудзь нявязка – вінавата другая. Выходзяць на вуліцу і бяруцца за чубы: хто каго перацягне.

А жыццё ўсё новыя прычыны для боек падкідвае. У Шабунькаў у акне лопнула шыба. Вырашылі, што ўсуседзі разбілі. У Цюпікаў працягнулі лапкі двое куранят. Значыць, суседзі атруцілі.

І пайшло, і паехала. І да таго дайшло, што цесна ім стала не толькі на вуліцы, але і наогул у адной вёсцы. Ішоў аднойчы Іван праз калгасны сад. А насустрач яму Лёдзя. Не размінуліся на сцяжынцы, сталі адзін другога калашмаціць. А потым абое навыперадкі пабеглі выклікаць міліцыю.

А то выпала разам каровы на пашу выганяць. Зноў не размінуліся, насадзілі адзін другому сінякоў. Лёдзя, Іванава жонка, нягледзячы на стары ўзрост, таксама б'ецца не горш за выпускніка баксёрскай секцыі. З кожным годам майстэрства ўдасканальваецца. І як толькі бойка – так міліцыю выклікаюць. Колькі часу патрацілі міліцыянеры, колькі бензіну спалілі, ездзячы і разбіраючы скандалы! А варожыя бакі яшчэ больш у азарт уваходзяць.

І раённы суд не раз іх судзіў. Плацілі штраф і Шабунькі, і Цюпікі. Але не ўціхамірыліся. Пішуць скаргі ва ўсе інстанцыі.

Нядаўна два варожыя бакі выклікаліся ў адну шаноўную раённую інстанцыю для прымірэння. І Шабунькі, і Цюпікі падпісаліся на афіцыйнай паперы, што больш не будуць абражаць адзін другога, спыняць бойкі. На тым і разышліся. А вечарам у міліцыю зноў паступіў званок:

– Хутчэй прыязджайце! – крычала ў трубку Лёдзя. – Суседка мяне забівае!..

Праз дзве хвіліны ў тэлефон ляментавала Казя:

– Іван з Лёдзяй мяне ледзь не парашылі!

Зноў паехалі варожыя бакі на экспертызу "здымаць пабоі", зноў дакучаюць работнікам міліцыі і пракуратуры: рабіце з намі што-небудзь, а то пазабіваемся да смерці.

А што больш з імі рабіць? Як раствлумачыць дарослым людзям, што жыць так сорамна, што сваімі паводзінамі яны смешаць усю вёску? Ні папярэджанні, ні ўшчуванні, ні штрафы не дапамагаюць. Не звяртаюць яны ўвагі і на слёзныя просьбы сваіх дарослых дзяцей, якія просяць не ганьбіць іх. Ды толькі курыная слепата засланіла суседзям вочы. На ўсё махнулі рукой, акрамя сваёй нечалавечай лютасці. І падаграваюць яе, і песцяць у сваіх сэрцах.

– Я заслужаны чалавек! Я шмат працаваў! – крычыць Іван Іванавіч.

Заслугі яго ніхто не змяншае. Але людзям незразумела, чаму ён ваюе з суседзямі, з якімі некалі быў у прыязных адносінах.

Скандал у Забэцках не заканчыўся. І з усёй гэтай гісторыі ўжо нават куры смяюцца.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ДЗЯТЛАВА

ЗА БІБЛІЯТЭЧНЫЯ КНІГІ ПРЫЙДЗЕЦЦА ПЛАЦІЦЬ

У Дзятлаўскай раённай бібліятэцы неўзабаве ўвядуць плату за кнігі павышанага попыту.

Творы, якія вялікім попытам не карыстаюцца, будуць выдавацца бясплатна. Гэта мера дазволіць бібліятэцы мець сродкі на набыццё новай літаратуры. Плата за атрыманне кніг будзе зусім невялікая.

ДЗЯТЛАЎЧАНЕ СПЯВАЛІ ВЫДАТНА

У Гродзенскім абласным драматычным тэатры адбыўся фестываль культур нацыянальных меншасцяў, якія жывуць на Беларусі.

Дзятлаўшчыну на ім прадстаўляла салістка Ганна Панько. Яна спявала ўкраінскія песні. Акампаніятарамі былі Аксана Шэйніна, Юрый Капцінскі, Таццяна Шорстка і Васіль Шыцько. Журы высока ацаніла выканаўчае майстэрства дзятлаўчан і ўручыла артыстам узнагароды.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

"АТЭЛА" З ДВАРЦА

У вёсцы Дварэц Дзятлаўскага раёна рабочы льнозавода падчас сямейнай сваркі спрабаваў рукамі задушыць сваю 30-гадовую жонку — бухгалтара гэтага ж завода.

Як значыцца ў міліцэйскай зводцы, мужчына пачаў душыць кабету дома, а затым пацягнуў на бераг возера. Калі жанчына страціла прытомнасць, ён спіхнуў цела ў ваду. Амаль утопленую жанчыну выратавалі выпадковыя прахожыя.

Мікола КАНАНОВІЧ

МАСТЫ

ВЕРХАЛАЗЫ З ВУЛІЦЫ ЗЯЛЁНАЙ

Жыхары дзевяціпавярховага дома, што па вуліцы Зялёнай у Мастах, вымушаны падымацца ў свае кватэры пешшу.

Ужо на працягу паўгода там не працуюць ліфты. Іх адключылі з-за адсутнасці сродкаў на тэхнічнае абслугоўванне.

ПАМЕРЛА ГЕРОЙ ПРАЦЫ ДОМНА ВАРАЦ

У вёсцы Рагозніца памерла Домна Іванаўна Варац, адзіны Герой Сацыялістычнай Працы на Мастоўшчыне.

Гэтую ўзнагароду яна заслужыла ў 60-гады мінулага стагоддзя за высокія пакашчыкі ў жывёлагадоўлі.

Нарадзілася Домна Варац у 1909 годзе ў вёсцы Княжаводцы. Муж загінуў у траўні 1945 года. Яна адна выгадавала чатырох дзяцей. Пачынаючы з 1939 года і да выхаду на пенсію працавала цялятніцай у калгасе імя Адама Міцкевіча.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ВАЎКАВЫСК

ХТО БАІЦЦА ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ?

У Ваўкавыску існуе вайсковагістарычны музей імя Багратыёна. 15 лістапада ў ім павінна была адкрыцца выстава твораў гродзенскага мастака Зміцера Іваноўскага.

Але ў апошні момант карціны вярнулі мастаку. Супрацоўнікі музея самі прыязджалі ў Гродна і выбралі для выставы 17 твораў Іваноўскага — партрэты Вялікіх князёў літоўскіх Віценя, Гедыміна, Альгерда, Кейстута, Вітаўта, вывы бітваў з крыжакамі і татарамі.

На карцінах былі выкарыстаны гістарычныя гербы "Пагоня", "Калюмны", бел-чырвона-белыя штандары. Як лічыць мастак, менавіта гэта магло напалохаць музейшчыкаў або іхніх "ідэалагічных апекуноў".

"Наша Свабода"

ТРИЛЛИОН РУБЛЕЙ ДОЛГОВ

Общая задолженность сельскохозяйственных предприятий Беларуси приближается к 1,1 триллиона рублей.

Такие данные обнародовал на пресс-конференции заместитель министра сельского хозяйства и продовольствия Анатолий Рубаник. По его словам, в названную сумму входят долги за энергоносители, по кредитам, ссудам, процентам и так далее. "Без помощи государства выйти из такого положения будет очень-очень сложно", — отметил замминистра. Задолженность по заработной плате в сельском хозяйстве на сегодняшний день составляет 23 миллиарда рублей. При этом число убыточных хозяйств в Беларуси продолжает расти. Как сообщил Рубаник, если в 2000 году на селе насчитывалось 1.185 убыточных хозяйств (48,2 процента), то по итогам 2001 года, по предварительным данным, их число возрастет до 1.400. Соответственно сократится и число прибыльных сельских хозяйств — с 1.072 в 2000 до 942 по итогам этого года. В то же время Анатолий Рубаник сказал, что нынешний год — не провальный. Продовольствием население будет обеспечено. Урожай зерна составил 5,3 миллиона тонн вместо запланированных 7 миллионов, однако, по словам замминистра, государственный заказ выполнен. Говоря о причинах недобора 1,7 миллиона тонн зерна, Рубаник посетовал на погодные условия и на потери при уборке.

ВЫРАСТУТ ЗАКУПОЧНЫЕ ЦЕНЫ НА МЯСО И МОЛОКО

До конца года в Беларуси произойдет очередное повышение цен на продукцию животноводства.


Как сообщил 14 ноября на пресс-конференции заместитель министра сельского хозяйства и продовольствия Николай Попков, предполагается, что закупочные цены на основные виды продукции животноводства — молоко, свинину и говядину — вырастут примерно в 1,5 раза. На сегодняшний день сказать, сколько будут стоить мясо и молоко в магазинах после планируемого повышения закупочных цен, в руководстве Минсельхозпрода затрудняются.

Нынешние цены на продукцию животноводства не устраивают сельскохозяйственных производителей, поскольку не покрывают издержек, и в результате животноводческая отрасль сегодня нерентабельна по всем видам продукции. Для сравнения Н.Попков назвал Россию, где, по его словам, молоко стоит в 2 раза больше, чем в Беларуси. Правда, что касается цен на мясо, то они в Беларуси и России сейчас примерно одинаковые.

Алексей ОРЕШКО

ПРИНЯТ ПРОЕКТ БЮДЖЕТА БЕЛАРУСИ НА 2002 ГОД

Распределение бюджетных средств по основным статьям расходов



Палата представителей Национального собрания Беларуси приняла в первом чтении проект бюджета страны на 2002 год. За принятие документа проголосовали 64 парламентария; против высказались 25.

Как сообщил, представляя проект депутатам, министр финансов Николай Корбут, доходная часть консолидированного бюджета в 2002 году запланирована в размере 7,53 триллиона рублей; расходная — 7,88 триллиона рублей. Дефицит бюджета должен составить 344 миллиарда 750 миллионов рублей (1,5 процента от ВВП). Покрываться бюджетный дефицит будет за счет целевых кредитов Национального банка (152 миллиарда, в том числе 132 миллиарда — на жилищное строительство); государственных ценных бумаг — 75 миллиардов рублей, а также путем привлечения кредитов правительства России на сумму 42 миллиона долларов США и осуществления иных мер. Основными источниками пополнения доходной части бюджета останутся налог на добавленную стоимость — 30,5 процента бюджетных поступлений; налоги на доход и прибыль — 16,3; подоходный налог — 12,5; акцизы — 8,3; доходы от внешнеторговых операций — 6,5. В 2002 году планируется также сократить общую налоговую нагрузку на 2,3 процента, что приведет к уменьшению доходных поступлений на сумму порядка 500 миллиардов рублей. Компенсировать эти потери правительство, по словам министра финансов, намерено за счет увеличения поступлений от подоходного налога с граждан, единого налога с предпринимателей, урегулирования с Россией вопроса о взимании НДС по принципу страны назначения продукции, а также за счет повышения эффективности использования государственной собственности.

Юрий ПОТЕМКИН

«ПАГОНЯ» ВСЕ ЖЕ БУДЕТ ВЫХОДИТЬ



19 ноября с 12.30 по 13.30 на ул. Советской в Гродно состоялся пикет в поддержку газеты "Пагоня".

После акции сотрудники милиции пригласили в ближайшее отделение РОВД редактора издания Николая Маркевича, журналистов Анджея Писальника и Павла Можейко. На всех троих были составлены протоколы за "участие в несанкционированном пикете". Суд над Маркевичем, Писальником и Можейко будет позже.

А на прошлой неделе состоялось собрание коллектива редакции гродненской газеты "Пагоня".

Газета, как известно, 12 ноября была закрыта по решению Высшего хозяйственного суда Республики Беларусь за якобы неоднократные нарушения законодательства о печати. Однако на момент обращения прокуратуры Гродненской области в суд, редакции в течение года было вынесено всего лишь одно предупреждение — за опубликование обращения незарегистрированной организации "Гродненская инициатива". Второе предупреждение прокуратура вынесла уже в ходе суда — когда выяснилось, что одного предупреждения недостаточно для закрытия издания.

На собрании редакции газеты было решено, что коллектив сохранит единство, будет добиваться отмены незаконного решения суда и начнет подготовку надзорной жалобы, а также документов на регистрацию новой газеты, в названии которой содержалось бы слово "Пагоня". Как сообщили сотрудники газеты, в последние дни редакцию лихорадит не только из-за судебных решений, но и в связи с выходом из строя компьютеров, что, как считает редактор газеты Николай Маркевич, также вызвано посторонним вмешательством. Тем не менее, электронная версия газеты продолжает выходить.

В интервью корреспонденту БелаПАН Николай Маркевич сказал, что намерен обратиться с открытым письмом в самые высокие международные организации, в парламенты и к президентам России, США, Польши, Украины, Литвы. В письме он расскажет о факте расправы над независимой газетой. "Мы исходим из того, что это не только плевок в лицо 10 сотрудникам "Пагоні" или 10 тысячам ее читателей, но и плевок в лицо цивилизованному международному сообществу. Белорусские власти теперь ждут реакции", — сказал Маркевич. По словам редактора, закрытие газеты идет в одном ряду с фальсификацией президентских выборов, с вандализмом властей в Куропатах. "Это и есть настоящее лицо режима. У происходящего есть логика — уровень образования, культуры, морали, чести и достоинства не позволяет его представителям действовать иначе. По-другому они не умеют и не хотят".

Напомним, что скандал вокруг газеты "Пагоня" разгорелся накануне президентских выборов, когда в одной из статей в № 36 был задан риторический вопрос: может ли баллотироваться на пост президента человек, на которого падает тень подозрений в причастности к исчезновению Юрия Захаренко, Виктора Гончара, Анатолия Красовского? Однако номер газеты был изъят и не попал к читателю. А по факту публикации возбуждено уголовное дело, которое не закрыто и по сегодняшний день.



Геннадий БАРБАРИЧ

ВАЛЮТА ОТ ПРОДАЖИ ОРУЖИЯ НА СПЕЦСЧЕТЕ

Средства, получаемые государством от реализации так называемых спецматериалов Министерства обороны — "танков и прочих вооружений", аккумулируются в "Беларусбанке" и находятся на счетах резервного фонда президента и стабилизационного фонда для обеспечения безопасности валютных вкладов.

Об этом, отвечая на вопросы депутата палаты представителей Ивана Пашкевича, заявил министр финансов Николай Корбут. При этом министр подтвердил, что данные средства не фигурируют "ни в какой статье бюджета". Вдаваться в подробности этой темы Николай Корбут отказался.

НА БЕЛОРУСА В ДЕНЬ ПО ОДНОМУ ДОЛЛАРУ

Беларусь — страна бедная — утверждает Всемирный банк. С позиции банка, бедным считается то государство, жители которого тратят в день менее одного доллара США.

Как раз столько, согласно проведенному Всемирным банком исследованию, расходует ежедневно преобладающая часть домохозяек нашей страны. Беларусь оказалась в группе "бедных" вместе с Афганистаном, Индией, Индонезией, Молдовой и Украиной.

Хартия'97

БЕЛОРУСЫ БЕЗЖАЛОСТНО ЭКСПЛУАТИРУЮТСЯ

«Трудящиеся в Беларуси безжалостно эксплуатируются. Ещё 2-3 года назад час рабочего времени стоил 49 центов, а сегодня он стоит 31 цент.

В Польше час рабочего времени в среднем стоит 2-3 доллара. А начинали мы с одинаковой стоимости рабочего времени».

Такое заявление сделала в интервью негосударственной радиостанции «Рацыя» Людмила Грязнова, депутат Верховного Совета республики 13-го созыва, один из членов оргкомитета общественной инициативы Хартия'97.

GazetaSNG.ru

УСТАНОВЛЕН ПРОЖИТОЧНЫЙ МИНИМУМ

Постановлением Совета Министров с ноября установлен новый размер бюджета прожиточного минимума (БПМ) в среднем на душу населения и по основным социально-демографическим группам.

БПМ в среднем на душу населения составляет теперь 52.541 рубль (на 1,1 процента больше бюджета на август-октябрь), для трудоспособного населения — 56.136 (плюс 1,6 процента), для пенсионеров — 43.631 (плюс 1,9 процента), студентов — 55.006 (плюс 1,4 процента), детей в возрасте от 3 до 16 лет — 58.681 (плюс 3,7 процента), детей в возрасте до 3 лет — 44.373 (плюс 5,9 процента).

В частности, МПБ для семьи из четырех человек составляет теперь 87.674 рубля (ранее — 84.120),

мужчины трудоспособного возраста — 104.245 (98.726),

женщины трудоспособного возраста — 103.885 (98.802),

молодой семьи с двумя детьми — 84.492 (80.373),

молодой семьи с одним ребенком — 94.103 (89.302),

семьи пенсионеров — 74.762 (71.905),

мужчины-пенсионера — 83.692 (80.362),

женщины-пенсионерки — 82.723 (79.190),

студента — 80.628 (76.878),

студентки — 80.362 (77.058),

девушки в возрасте от 14 до 18 лет — 100.936 (97.615),

юноши в возрасте от 14 до 18 лет — 106.320 (102.667).

Средний удельный вес основных статей потребительских расходов в МПБ: питание — 49,3 процента (ранее — 51), одежда, белье, обувь — 22 (21,1), предметы культурно-бытового и хозяйственного назначения — 8,5 (8,1), предметы санитарии, гигиены, лекарства — 2,8 (2,8), оплата жилья и коммунальных услуг — 7,2 (7,3), бытовые услуги, транспорт — 6 (6).

Размер среднемесячной начисленной заработной платы рабочих и служащих в сентябре, в ценах которого рассчитаны нынешние МПБ, составил 147.001 рубль.

БелаПАН

ПРАВОЗАЩИТНИК ИГНОРИРУЕТ СУД

Ведущий Белорусского телевидения Евгений Новиков, автор программы "Права человека: взгляд в мир" будет привлечен к административной ответственности из-за проявленного неуважения к суду (статья 166—1 Кодекса об административных правонарушениях Республики Беларусь).



Евгений Новиков (справа) во время дискуссии

Как сообщил БелаПАН руководитель пресс-службы Союза христиан веры евангельской (Союз ХВЕ) Александр Величко, такое определение 8 ноября вынес суд Первомайского района города Минска.

В этот день на судебном заседании рассматривалось дело о защите чести и деловой репутации. Истцами по делу выступили Союз ХВЕ и церковь ХВЕ города Старые Дороги (Минская область). Они подали в суд на Национальную государственную телерадиокомпанию Беларуси, Евгения Новикова и редакцию газеты "Навіны Старадарожчыны", которые обвинили протестантскую общину Старых Дорог в совершении тяжкого преступления.

По словам г-на Величко, 9 и 16 апреля 2001 года в программе Евгения Новикова прозвучала информация о человеческом жертвоприношении, якобы имевшем место в церкви ХВЕ Старых Дорог. В подтверждение были приведены слова Веры Орловской, которая заявила, что ее сын был отравлен "неизвестным науке ядом" и принесен в жертву. По факту смерти дьякона церкви ХВЕ Сергея Орловского прокуратурой Стародорожского района была проведена проверка, в результате которой обвинения в адрес общины не подтвердились. "Кроме того, пастор церкви ХВЕ из Старых Дорог Павел Дуля уверен, что публикация ряда статей в районной газете "Навіны Старадарожчыны", порочащей протестантское движение, спровоцировала нападение неизвестных на церковь ХВЕ в деревне Синегово Стародорожского района летом 2001 года. Это событие произошло через несколько дней после публикации одного из материалов", — сказал Величко.

По его словам, принятие жестких мер в отношении Новикова было вызвано неоднократной неявкой ответчика на судебные заседания. Кроме того, в телефонном разговоре с судьей Викторией Зайцевой, рассматривающей дело, Новиков заявил, что "не намерен являться на данное судебное заседание". После такого заявления судья решила привлечь Новикова к административной ответственности, а также приняла решение о принудительном приводе правонарушителя, согласно статье 169 Гражданского процессуального кодекса Республики Беларусь. Как отметил Александр Величко, следующее судебное заседание состоится 20 декабря, на которое милиция должна будет доставить ведущего БТ.

Марат ГОРЕВОЙ

ЕДИНЫЙ НАЛОГ БУДУТ ПЛАТИТЬ И ХУДОЖНИКИ



В мастерской художника

В Беларуси дополнен Перечень видов деятельности, при осуществлении которых индивидуальные предприниматели и иные физические лица уплачивают единый налог, а также базовых ставок единого налога.

В перечень, в частности, включены произведения живописи, графики, скульптуры, предметы народных промыслов. Декрет о внесении изменений и дополнений в декрет от 17 мая 2001 года президент Александр Лукашенко подписал 8 ноября.

Как отмечается в официальном комментарии к декрету, дополнения направлены в первую очередь на сохранение и развитие народных художественных промыслов, творческой деятельности граждан. Их внесение обусловлено необходимостью выделения некоторых видов товаров (произведений живописи, графики, скульптуры и предметов народных промыслов) в отдельную товарную группу в целях исчисления единого налога.

До внесения дополнений уплата единого налога при реализации предметов изобразительного искусства и народных промыслов производилась исходя из ставок налога, установленных по группе "иные непродовольственные товары", что не в полной мере учитывало специфику данного вида деятельности.

Конкретные ставки единого налога при реализации произведений живописи, графики, скульптуры и предметов народных промыслов должны быть установлены областными и Минским городским Советом депутатов в месячный срок со дня вступления декрета в силу — после официального опубликования.

БелаПАН

НА ЗАВОДАХ НАЗРЕВАЮТ АКЦИИ ПРОТЕСТА

Профсоюзный комитет Гомельского завода пусковых двигателей от имени тысячного коллектива рабочих заявил о готовности к массовым акциям протеста.

Согласно информации председателя профкома завода пусковых двигателей Александра Кизева, возмущение коллектива вызывают прежде всего продолжительные невыплаты зарплаты. Только совсем недавно администрация завода смогла рассчитаться с рабочими за август. В то же время задолженность за сентябрь составляет 75 миллионов рублей. Через две недели дирекция уже должна выплачивать зарплату и за октябрь, что вообще нереально.

В КАЗАХСТАН БУДЕМ ЕЗДИТЬ БЕЗ ВИЗ

Сенат Казахстана ратифицировал Соглашение между правительствами Беларуси, Киргизии, Таджикистана, России и Казахстана о взаимных безвизовых поездках граждан.

Это произошло 12 ноября на пленарном заседании Сената Казахстана, прошедшем под председательством Омирбека Байгелди.

GazetaSNG.ru

ЭКСПАНСИЯ РОССИЙСКОГО КАПИТАЛА ПРОДОЛЖАЕТСЯ

Крупные российские инвесторы уже определили для себя круг первоочередных объектов белорусской промышленности для вложения средств в их модернизацию.

Это, прежде всего, "МАЗ", "Полимир", "Нафтан" и еще несколько индустриальных гигантов. Эти предприятия будут акционированы с участием инвесторов из России. На "МАЗе" готовы к подобному повороту событий и ждут от потенциального инвестора "Сибирского алюминия" технико-экономического обоснования вхождения минского автозавода в холдинг.

Союз-инфо

И ЗА КОНФЕТЫ ПОСАДИТЬ МОГУТ

Конституционный суд (КС) Беларуси решил, что уголовное законодательство позволяет привлекать к уголовной ответственности преподавателей высших и средних специальных учебных заведений за получение незаконного вознаграждения от студентов.

Об этом на встрече с журналистами сообщил председатель Конституционного суда Григорий Василевич. По его словам, такое решение было принято КС 12 ноября.

Рассмотрение данного вопроса проводилось по обращению Совета Министров. Совмин, в частности, указал на противоречивость следственной и судебной практики по привлечению к уголовной ответственности преподавателей высших и средних специальных учебных заведений, которые получают вознаграждение от студентов за выставление оценок на курсовых экзаменах и зачетах. В одних случаях такие преподаватели осуждаются за получение взятки, в других — освобождаются от уголовной ответственности за отсутствием состава преступления. Как сообщил Василевич, согласно решению суда, преподаватели относятся к категории лиц, уполномоченных совершать юридически значимые действия, и могут привлекаться к уголовной ответственности за взяточничество. Конституционный суд также обратил внимание Верховного суда Беларуси на необходимость обеспечения единого подхода при рассмотрении подобных дел.

Юрий ПОТЕМКИН

У СОСЕДЕЙ ЗАРПЛАТА, А У НАС ПРОЕКТЫ

К концу 2002 года реальная заработная плата работников бюджетной сферы должна составить 110 долларов США в эквиваленте — такой прогноз содержится в проекте республиканского бюджета на 2002 год.

Об этом сообщил министр финансов Беларуси Николай Корбут, выступая перед постоянными комиссиями Палаты представителей Национального собрания. На конец 2001 года, по словам министра, реальная заработная плата в бюджетной сфере составит порядка 78 долларов США.

В то же время, отметил Корбут, при таком незначительном повышении заработной платы в 2002 году население должно будет оплачивать в среднем 40 процентов стоимости жилищно-коммунальных услуг (сейчас оно оплачивает 29,3 процента). По данным Министерства жилищно-коммунального хозяйства, при 40-процентном покрытии себестоимости жилищно-коммунальных услуг плата за проживание четырех человек в трехкомнатной квартире в отопительный период составит 47 тысяч рублей, трех человек в двухкомнатной квартире — 34 тысячи, двух человек в однокомнатной квартире — 23 тысячи.

Кроме того, как сообщил Николай Корбут, в 2002 году должна возрасти стоимость проезда в общественном транспорте. В регионах пассажиры должны будут оплачивать до 75 процентов себестоимости поездки, в Минске — до 50 процентов.

Юрий ПОТЕМКИН

МОГИЛЕВСКИЙ УКЛОН В БЮДЖЕТЕ

Проект бюджета Беларуси на 2002 год имеет явный "могилевский уклон". Об этом 13 ноября на пресс-конференции в Минске заявил эксперт аналитического центра "Стратегия", заместитель председателя Объединенной гражданской партии (ОГП) Ярослав Романчук.

В частности, по его словам, поступления от налогов на доходы (с физических лиц) и прибыль (с юридических лиц) практически стопроцентно остаются в распоряжении Могилевской области. В то время как, например, Гомельская область получит 51,3 процента (в 2001 году — 33 процента), а Минск — 33,3 процента (вместо 25 процентов в этом году).

Заместитель главы ОГП привел и ряд других примеров, которые, по его мнению, заметно выделяют Могилевскую область из общего контекста регионального финансирования. При этом в ОГП отмечают, что данный регион имеет один из самых плохих показателей по количеству убыточных предприятий, по рентабельности, по объему складских запасов и долгов перед бюджетом по налогам, перед поставщиками по энергоресурсам и перед рабочими — по зарплате. "Получается, что область не зарабатывает деньги, генерирует долги и при этом получает все больше и больше льгот и денег из республиканского бюджета", — заключил Ярослав Романчук.

БелаПАН

БЕЛОРУССКИЙ МИД СДЕЛАЛ ЗАЯВЛЕНИЕ

"Одиозным" назвал глава белорусского МИДа Хвостов внесенный на рассмотрение в Конгресс США законопроект "Акт о демократии в Беларуси".

По его мнению, этот документ ведет к прекращению дипломатических связей между двумя странами. Указанный законопроект, внесенный американским сенатором Джесси Хелмсом, предусматривает выделение 30 миллионов долларов США "на восстановление и укрепление институтов демократического правительства в Беларуси".

Принятие Конгрессом США законопроекта сенатора Джесси Хелмса "Акт о демократии в Беларуси 2001" в предложенном виде нереально. Такое мнение БелаПАН высказал эксперт аналитического центра "Стратегия", заместитель председателя Объединенной гражданской партии (ОГП) Ярослав Романчук. Скептически оценивая возможность принятия данного законопроекта, Романчук, вместе с тем, отметил, что его появление — это "серьезный звонок" белорусским властям. Что касается возможных санкций в экономике, то, как отметил заместитель председателя ОГП, сегодня торговый оборот Беларуси и США весьма незначителен. В то же время, по его мнению, угроза санкций может напугать людей, ведущих бизнес с Беларусью или тех, кто имеет счета в Соединенных Штатах Америки.

Романчук также считает, что положение нынешних властей Беларуси, с учетом потепления отношений России и США, становится все более шатким и эфемерным. По его мнению, ужесточение позиции Москвы по отношению к происходящему в Беларуси не за горами: "Если на карту будет поставлен стратегический союз "США — Россия — НАТО" и некие мифические таможенные и прочие союзы в СНГ, то, конечно же, прагматический Кремль выберет первый вариант". При этом формально риторика может оставаться прежней, но суть процессов будет наверняка не в пользу официального Минска, отметил Романчук.

Алексей ОРЕШКО

Афганистан

ПЛАНЫ БЕН ЛАДЕНА БЫЛИ СОРВАНЫ РОССИЙСКОЙ РАЗВЕДКОЙ

Российская разведка еще до 11 сентября знала о планах бен Ладена. Многие его детали были фантастичны, и поверить в подлинность сведений было сложно. Но все же помешать Ладену удалось...



Афганские беженцы

На прошлой неделе отдельные научно-исследовательские учреждения Москвы по линии силовых структур получили указание проанализировать исторический опыт сухопутных операций иностранных армий в Афганистане (в основном английской и советской). Требовалось ответить на вопрос — можно ли победить талибов в воздушно-наземной операции? А если можно, то как?

Возникает ряд вопросов. Почему именно сейчас проявился интерес к историческому опыту? Не связано ли это с разработкой новой военно-стратегической концепции по отношению к Афганистану? По сведениям из осведомленных источников в соответствующих структурах, атаку против Америки Усама бен Ладен готовил около трех лет, истратив на это около 100 млн долларов. Деньги шли на профессиональную (летную) подготовку будущих камикадзе и их "достойный" быт, на подкуп американских чиновников, в той или иной мере связанных с внутренними воздушными авиалиниями. Последняя "статья расходов" представляется особенно важной для России. Дело в том, что в логической последовательности план бен Ладена строился следующим образом.

1. Разгром сил Северного альянса (с этой целью за несколько дней до 11 сентября два арабских смертника подрывают лидера северян Ахмад Шаха Масуда);

2. Стремительное продвижение к северным границам Афганистана;

3. В день удара по Америке перейти эти границы и начать продвижение в трех направлениях: Таджикистан, Узбекистан и Туркмения. Москва оперативно не реагирует — 201-я российская дивизия в Таджикистане не готова к широкомасштабным действиям; узбекская и туркменская армии практически недееспособны, да и границы здесь почти не охраняются;

4. В такой ситуации неизбежный акт возмездия США будет менее чувствительным. Ведь Москва не позволит американцам бомбить бывшие республики СССР. Конфликт Россия — Америка неизбежен;

5. Начинаются массовые антиамериканские манифестации в Пакистане, Иране, Ираке, Палестине, Египте, Судане и других странах, на финансирование которых уже перечислено более 10 млн долларов;

6. Так или иначе, но политические консультации с лидером талибов муллой Мухаммедом Омаром неминуемы. Они закончатся международным признанием его режима в качестве полноправного хозяина "единого исламского Афганистана";

7. Талибские войска выводятся из республик Средней Азии;

8. Усама бен Ладен и его организация "Аль-Каида" на время выходят из игры.

Разработанный "сценарий" представлялся российским спецслужбам как очередная бредовая идея "террориста №1". Что за "удар по Америке", да и можно ли убить любимца северян Масуда? Хотя отдельные положения заслуживали анализа, зная, что в штабе бен Ладена имеется интернациональная команда "стратегов", способная преподнести любой сюрприз... Теперь проследим за развитием событий.

7 сентября исламские "шахиды" подрывают А.Ш.Масуда. Армия северян обезглавлена. В тот же день его труп в обстановке строжайшей секретности на вертолете переправляется в Таджикистан, а бойцам альянса объявляется, что их любимый командир слегка ранен во время интервью и держит ситуацию под контролем. Он просит моджахедов с "удвоенной энергией" ударить по талибам, отомстив тем самым за их "подлый поступок".

Такая фальсификация была немедленно сработана российскими спецслужбами, сумевшими быстро отреагировать на новую — неприятную для России ситуацию. К тому же были немедленно проведены консультации с наиболее влиятельными полевыми командирами Масуда, оказана помощь оружием.

Это сыграло свою роль. Многочисленные попытки талибов прорвать оборонительные рубежи северян не увенчались успехом. Более того, "борцы за веру" несли большие потери. 10 сентября из Кабула поступила команда: приостановить наступление и ждать сигнала. Так и поступили. Но приостановить "атаку на Америку" было уже поздно. Механизм был запущен. В объединенном штабе Мухаммед Омар — бен Ладен решили "покончить" с Северным альянсом "после Вашингтона и Нью-Йорка".

... Кадры американской трагедии были ужасны. А если бы "сработали" все пункты "бенладеновского" плана? Тогда талибы стояли бы сегодня в пригородах Ашхабада, Ташкента и Душанбе.

Владимир ЛЕВИН

Украина

НОВЫЙ ЗЕМЕЛЬНЫЙ КОДЕКС КУЧМА ПОДПИСАЛ

Президент Украины Леонид Кучма утвердил новый Земельный кодекс, который вступит в силу с 1 января будущего года.

Продажа и дарение земли будут разрешены с 1 января 2005 года. До 1 января 2010 года в одни руки можно будет скупить не более 100 гектаров земли. Иностранцы смогут покупать украинскую землю только через 20 лет.

Верховная рада (парламент) Украины приняла Земельный кодекс, после чего документ был направлен на подпись президенту. Против принятия Кодекса голосовала фракция коммунистов, которая в знак протеста разбила в парламенте электронную систему голосования и покинула зал. В отсутствие коммунистов депутаты проголосовали бюллетенями.

Согласно новому Земельному кодексу, гражданин Украины имеет право бесплатно получить 2 гектара земли (5 акров) для ведения подсобного хозяйства. Кроме приусадебного участка, разрешено приватизировать 5 гектаров леса, 0,3 акра земли под садоводство, 1000 кв. м. — под дачу, 100 кв. м. — для строительства гаража. На приватизированной земле граждане вправе выращивать на продажу елки, выкопать пруд и разводить в нем рыбу.

В отличие от простых граждан украинские фермеры должны будут выкупить свои наделы, которые раньше им предоставлялись в аренду для ведения фермерского хозяйства.

ПРИМА

Либерия

ПРЕЗИДЕНТ ПУБЛИЧНО ВЫСЕК СВОЮ ДОЧЬ

Либерийский президент Чарльз Тейлор публично выпорол свою тринадцатилетнюю дочь за то, что она плохо ведет себя в школе.

Тейлор велел девочке лечь на скамейку и десять раз ударил палкой по спине в присутствии ее друзей и одноклассников. Когда воспитательный процесс закончился, африканский правитель предупредил ошеломленных подростков, что как глава государства он несет ответственность за дисциплину не только собственных детей (у него их 10 родных и 20 приемных), но и детей всей страны. После чего гордо покинул школу.

Елена СОЛОВЬЕВА

Украина

МАРАЗМ ЛИДЕРА ПАРТИИ

Елена Солод (небезызвестная своими неординарными политическими PR-технологиями лидер партии "Единая Семья") подала в ЗАГС Коммунаровского района города Запорожье документы на изменение фамилии, имени и отчества.

Каким же было удивление работников ЗАГСа, когда в графе избранных ФИО Елена Солод вписала — "Усама бен Ладен".

В ответ на всеобщий шок и сменивший его смех, Солод в резкой форме заявила, что по закону она соблюла все нюансы, отказать ей не имеют права.

Попытки убедить женщину не делать глупостей, ведь Усама бен Ладен, во-первых, имя мужское; во-вторых, его носит террорист; в-третьих, правки ФИО матери будут внесены в свидетельства о рождении детей и свидетельство о браке, увенчались полным фиаско.

